## Душ для комбайнера – не роскошь!

**В горячую пору деревенской страды каждая минута важна. Но и об условиях труда для участников жатвы забывать нельзя. Как решен этот вопрос в нашем районе, узнавала журналист «ДК»**

с. 3

Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№60 (11079) Серада 4 жніўня 2021 года

# Кінуў пальчатку сапернікам



## 13-гадовы дабрушанін прадставіць Беларусь на Чэмпіянаце Еўропы ў Сараеве

**Падчас выступлення Уладзіслава Смяглікава на Алімпіядзе ў Токіа ўся сям'я дабрушан Пуцько сабралася каля тэлевізара. Больш за іншых за свайго куміра хваляваўся 13-гадовы Уладзімір. Для яго ён – не проста зямляк. Надзейны сябар, калега ў спорце, з удзельнікам Алімпійскіх гульняў ён трэніруецца на адным рынгу ў Гомельскім абласным цэнтры алімпійскага рэзерву.**

– Надзеў пальчаткі ў 11-гадовым узросце, – расказвае Уладзімір. – Захапіўся боксам з першага занятку. А калі праз некаторы час перамог у паядынку, пачаў займацца з падвоенай энергіяй.

У спорце малады баксёр арыентуецца на бацьку Аляксандра. У юнацтве той таксама займаўся боксам, удзельнічаў у спаборніцтвах. Ды і сёння ён – аматар здаровага ладу жыцця. Вось толькі па тытулах, колькасці медалёў і грамат сын ужо апярэджвае бацьку з вялікім адрывам.

– Кожнае яго выступленне глядзім у Інтэрнэце ў рэжыме рэальнага часу, – прызнаецца Аляксандр Пуцько. – Калі вяртаецца з перамогай – у доме свята. Стараемся заахвоціць яго не толькі словамі. Традыцыйнымі сталі падарункі.

Юны спартсмен, дарэчы, нядаўна абараніў званне кандыдата ў майстры спорту па боксе. А на рэспубліканскай спартакіядзе школьнікаў 2021 года стаў чэмпіёнам у вагавой катэгорыі 90 кілаграмаў і ўвайшоў у склад зборнай краіны. 10 жніўня ён прадставіць Беларусь на Чэмпіянаце Еўропы ў сталіцы Босніі і Герцагавіны горадзе Сараеве.

– Мару звязаць жыццё са спортам, – прызнаецца Уладзімір. – Скора стану вучнем спартыўнага інтэрната пры цэнтры алімпійскага рэзерву і змагу больш часу аддаваць трэніроўкам. Галоўнае, бацькі падтрымліваюць маё рашэнне.

**Сяргей ВОЛЬГІН**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

Год народного единства

## О главном на языке музыки

**Концертная программа народной арт-группы «Бульбаш» собрала вместе любителей самобытного творчества**

с. 5

Эхо события

## Праздник «голубых беретов»

**На дружеской встрече десантников района побывали журналисты «ДК»**

с. 4

Проблемный ракурс

## Чья трава у дома

**Кто должен бороться с зарослями на деревенских улицах?**

с. 6

ISSN 2073-1000

**погода**

**Долгота дня 15.33**
**Луна**
**5, 6 августа — в Раке, 7, 8 — во Льве**

**Последняя четверть**

**5 августа**
**НОЧЬЮ +16…+17**
**ДНЕМ +23…+25**
Небольшая облачность.
Возможен дождь.
Ветер южный, 1-3 м/с

**6 августа**
**НОЧЬЮ +20…+22**
**ДНЕМ +26…+28**
Облачно с прояснениями.
Без осадков.
Ветер южный, 1-2 м/с

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# «Главная задача – сохранить людей»

## Александр Лукашенко расставил приоритеты в работе МЧС

**Президент Беларуси Александр Лукашенко принял с докладом министра по чрезвычайным ситуациям Вадима Синявского.**

Глава государства обратил внимание, что Вадим Синявский был назначен на пост министра совсем недавно. «Пошли нетрадиционным путем, пригласив вроде бы со стороны человека (до назначения в МЧС в марте 2021 года Вадим Синявский работал на посту начальника УВД Гродненского облисполкома. – Прим. БелТА). Хотя вряд ли это совсем со стороны. Но тем не менее, какова ситуация с вашей точки зрения в Министерстве по чрезвычайным ситуациям, как люди приняли, какие Вы видите там недостатки?» – поинтересовался белорусский лидер.

Президент напомнил, что недавно на его уровне были приняты решения, в том числе по предложению нового министра, на основании заключения Госсекретариата, касающиеся совершенствования структуры МЧС. Глава государства также обратил внимание на большие цифры по гибели людей на водоемах: «Меня удивляет один факт – мы так переживаем за COVID, нас критиковали и там и здесь – у нас на воде утонули более 350 человек с начала года. Больше 80 процентов из них в нетрезвом состоянии. Можно было сказать – сами виноваты. Но есть же доля ответственности и наша».

Александр Лукашенко попросил доложить и об обстановке с пожарами, в том числе по количеству погибших и спасенных людей: «Главная наша задача – сохранить людей. Ну и экономика – не нанести ущерб, или чтобы этот ущерб был самым минимальным».

Президент Беларуси обратил внимание на проблему с лесными пожарами в ряде стран. В связи с этим – вопрос, как складывается обстановка в Беларуси.

Вадим Синявский доложил, что за время его нахождения в занимаемой должности удалось оперативно объехать все областные управления МЧС, отдельные органы и подразделения, в том числе отряды, которые дислоцируются на крупных промышленных предприятиях. «Посмотрел на организацию работы, изучил их возможность реагирования, действия. Хочу доложить о том, что ежесуточно отрабатываем более 4 тысяч сообщений граждан на единые номера 101 и 112. Все граждане получают квалифицированную помощь. При необходимости – в том числе физическую помощь в обеспечении их защиты», – доложил министр.

**По материалам БелТА**

ЮБІЛЯРЫ

Выдатнік народнай адукацыі БССР, заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь Віктар Серпікаў адзначыў 75-гадовы юбілей

# Жыццёвая праўда Віктара Серпікава

**Насовіцкую школу апошнія паўвека немагчыма ўявіць без педагога, краязнаўцы, журналіста, паэта Віктара Серпікава. Спіс напрамкаў, дзе ён дасягнуў поспеху, можна працягваць.**

Ён актыўна вядзе старонкі ў сацыяльных сетках. На большасці фотаздымкаў Віктара Пятровіча ён – у акружэнні школьнікаў. Выхаванню іх педагог прысвяціў паўвека. Сёлета 1 верасня Віктар Серпікаў, як і заўсёды, прыйдзе на школьны двор. Толькі на гэты раз на лінейцы папрысутнічае госцем.

> ✔ Веласіпед і турыстычны рукзак – усё, што трэба Віктару Серпікаву, каб адчуваць сябе шчаслівым.

– Нарэшце, стану сапраўдным пенсіянерам. А школьны музей, які лічу адным з самых важных дасягненняў у жыцці, перадаю ў надзейныя рукі – дачцэ Галіне. Яна, як некалі і я ўслед за бацькам, прадоўжыла сямейную дынастыю педагогаў, – паведаміў Віктар Серпікаў.

Школьны музей, які лічаць унікальным па колькасці сабраных тут экспанатаў, суразмоўца называе не інакш як "маё жыццё". Тут у кожнай дэталі ёсць часцінка душы стваральніка. Паглядзіш на іх і разумееш: рэчы не толькі расказваюць гісторыю. Іх шлях у пакойчык музея – таксама цікавы. Экспанатамі стала этажэрка з бацькоўскай хаты суразмоўніка, стол, які змайстраваў бацька. Асобнае месца займае ваенная форма, у якой Віктар Пятровіч вярнуўся з арміі.

У адукацыі Віктар Серпікаў адпрацаваў 50 год

Яго цяжка ўявіць з вудай на беразе ракі або ў полі за клопатам аб раслінах. Веласіпед і турыстычны рукзак – вось і ўсё, што трэба Віктару Серпікаву, каб адчуваць сябе шчаслівым. Яго метады прапаганды турызму калегі педагога характарызуюць як аўтарскія.

– Турызм і краязнаўства адкрылі шмат магчымасцяў у маім жыцці, – адзначыў юбіляр. – Дзякуючы веласіпедным вандроўкам мы наладзілі супрацоўніцтва з расійскімі калегамі. З рабятамі наязджалі сотні кіламетраў па вёсках. Нярэдка вярталіся з гэтых экспедыцый з экспанатамі для школьнага музея і матэрыяламі для новых праектаў.

Пры гэтым, прызнаўся апантаны ідэямі чалавек, яму шкада, што ў прафесійным плане нават за паўвека не паспеў зрабіць усяго, што хацелася. Так і не ўбачыла свет кніга пра гісторыю вёсак Антонаўка, Лагуны і Насовічы, унікальную інфармацыю для якой ён збіраў больш за 20 год. Яшчэ не высветлены імёны ўсіх загінуўшых падчас Вялікай Айчыннай вайны землякоў. Словам, у бліжэйшы час дарогу ў школу наўрад ці забудзе, – паабяцаў юбіляр.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

*Лепшыя паказчыкі на ўборцы зерневых і зернебабовых па стане на 2 жніўня (па інфармацыі райкама прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу)*

### Па намалоце сярод экіпажаў

Варганаў Мікалай Анатольевіч, Ігнаценка Аляксандр Дзмітрыевіч з ААТ "Калінінскі" на КЗС-1218 намалацілі 1435 тон.

Белавусаў Сяргей Віктаравіч, Белавусаў Аляксандр Уладзіміравіч з ААТ "Калінінскі" на КЗС-1218 намалацілі 1304 тоны.

Самойленка Пётр Рыгоравіч, Варганаў Андрэй Мікалаевіч з ААТ "Калінінскі" на КСЗ-1218 намалацілі 1273 тоны збожжа.

### На адвозцы зерня ад камбайнаў

Зур Мікалай Аляксеевіч з ААТ "Завідаўскае" на МАЗ-6501 перавёз 2985 тон.

Мінчанка Мікалай Іванавіч з ААТ "Завідаўскае" на К704-Р4 перавёз 2394 тоны зерня.

Скарабагаты Уладзімір Мікалаевіч з ААТ "Калінінскі" на МАЗ-551605 перавёз 1712 тон зерня.

### Па намалоце сярод маладзёжных экіпажаў

Кушняроў Аляксандр Міхайлавіч з КСУП "Кругавец" на КЗС-12 убраў 328 гектараў плошчаў і намалаціў 1113 тон зерня.

Бужан Віктар Віктаравіч і Добышкаў Генадзь Іванавіч з ААТ "Калінінскі" на КЗС-10К убралі 228 гектараў і намалацілі 868 тон збожжа.

### Па ўраджайнасці сярод гаспадарак раёна

У ААТ "Калінінскі" (кіраўнік Віктар Байдаў) убрана 58,4 працэнта плошчаў, ураджайнасць складае 37,4 цэнтнера з гектара.

У ААТ "Завідаўскае" (кіраўнік Таццяна Бялян) убрана 83 працэнты плошчаў, ураджайнасць складае 31,3 цэнтнера з гектара.

У ААТ "Уцеўскае" (кіраўнік Аляксандр Дробышаў) убрана 73,9 працэнта плошчаў, ураджайнасць складае 29,1 цэнтнера з гектара.

НА СВЯЗИ

**7 августа с 9.00 до 12.00 по телефону 7-50-10**
прямую телефонную линию с жителями района проведет Геннадий Викторович МАЛЬЦЕВ, заместитель председателя райисполкома.

* * *

**5 августа с 10.00 до 12.00 по телефону 5-99-13**
пройдет прямая телефонная линия с участием Александра Владимировича АГЕЕВА, заместителя председателя комиссии по делам несовершеннолетних райисполкома.

ПРИЕМ

**7 августа с 8.00 до 13.00**
в райисполкоме прием граждан проведет Геннадий Викторович МАЛЬЦЕВ, заместитель председателя райисполкома.

* * *

**7 августа с 8.00 до 13.00**
в приемной председателя райисполкома прием граждан проведет Надежда Владимировна ШЕВЧЕНКО, начальник финансового отдела райисполкома.